# Білет 24

**Практычнае заданне.**

**Гаспадарчае жыццё на тэрыторыі Беларусі ў IX–XIII стст. Шляхі ўзнікнення гарадоў, іх роля.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Назавіце пяць гарадоў, якія ўзніклі на тэрыторыі Беларусі адпаведна ў IX, X, XI, XII, XIII стст.
2. Як узнікалі гарады на тэрыторыі Беларусі ў сярэднявечны? Якія эканамічныя функцыі яны выконвалі?
3. Складзіце схему «Асноўныя гаспадарчыя заняткі ўсходніх славян у IX–XIII стст.».
4. Дакажыце, што ва ўсходніх славян у IX–XIII стст. была натуральная гаспадарка.

## I. Картасхема “Старажытныя беларускія гарады”




| | |
|---|---|
| 1147 | Гады першага ўспаміну гарадоў у пісьмовых крыніцах |
| • | Гарадзішчы старажытнарускага часу, якія выяўлены археолагамі |
| | Найбольш важныя гандлёвыя шляхі |
| | Волакі |
| | Гандаль беларускіх гарадоў (з указаннем напрамку і тавараў) |

**II. Развіццё беларускіх зямель у IX–XIII стст.** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. 6 клас»).*

Галоўнымі заняткамі ўсходніх славян былі земляробства і жывёлагадоўля. Да XIII ст. падсечна-агнявое земляробства было выцеснена ральнічным у форме двуполля і трохполля. Больш шырокае распаўсюджванне атрымала двуполле. Пры сістэме земляробства, якая атрымала назву "трохполле", поле дзялілася на тры часткі. Адна трэць засявалася яравымі, другая - азімымі, а трэцяй даваўся адпачынак. На беларускіх землях былі распаўсюджаныя многія вядомыя ў наш час культуры: пшаніца, проса, жыта, гарох, грэчка, лён. Ураджай зжыналі жалезнымі сярпамі або косамі. Збожжа малацілі драўлянымі цэпамі і малолі ў муку пры дапамозе каменных жорнаў. Разводзілі кароў, коней, свіней, коз, авечак.

Важнымі заняткамі для нашых продкаў заставаліся паляванне і рыбная лоўля. Палявалі на ласёў, зуброў, аленяў, дзікоў, мядзведзяў і інш. Здабывалі таксама футра пушных звяроў. Лясныя багацці - ягады, грыбы - дапаўнялі стол земляроба.

Шырокае распаўсюджванне мела бортніцтва. Збор мёда дзікіх пчол быў не меней складаным, чым паляванне. Мёд і воск тады высока шанаваліся: на іх быў вялікі попыт у Візантыі і іншых краінах.

Самыя простыя рэчы, неабходныя ў паўсядзённым побыце, выраблялі ў кожнай хаце. Так, напрыклад, амаль усе жанчыны ўмелі прасці і ткаць. Складаныя рэчы, асабліва з металу, рабілі рамеснікі, якія меліся амаль у кожнай вёсцы. Вясковыя жыхары амаль цалкам забяспечвалі сябе ўсім неабходным для жыцця - на беларускіх землях доўгі час панавала натуральная гаспадарка.

Князь і блізкія да яго людзі павінны былі знайсці спосабы для свайго забеспячэння. Сродкі патрабаваліся таксама для вядзення войн, прыёму замежных пасольстваў і г.д. Асноўным спосабам задавальнення гэтых патрэб з'яўляўся збор даніны. Першапачаткова князь збіраў даніну з падуладнага насельніцтва ў ходзе палюддзя. Разам з дружынай ён аб'язджаў паселішчы падуладнай тэрыторыі. Тут ён прымаў дары прадуктамі харчавання, мяхамі, рамеснымі вырабамі, а таксама чыніў суд. З сярэдзіны X стагоддзя насельніцтва стала звазіць даніну ў асобныя пункты - пагосты. Пазней збор даніны пачаў праводзіцца ў гарадах.

**III. Схема. Узнікненне гарадоў і іх роля ў сярэднявеччы**

